Падтрымай "Вясну" на PATREON

Да месяца арышту асудзілі берасцейца, які на будынку працытаваў малітву: "Но избави нас от лукавого"

07.04.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед

Суд Маскоўскага раёна Брэста 7 красавіка асудзіў па арт. 341 Крымінальнага кодэкса (апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці) Андрэя Леванюка за цытату з малітвы на фасадзе жылога дома "Но избави нас от лукавого". Суддзя Вера Філонік прызнала мужчыну вінаватым і пакарала яго месяцам арышту. На судзе Андрэй пагадзіўся, што надпіс наносіў ён. Але адзначыў, што будынак ужо да гэтага неаднаразова быў "пашкоджаны" іншымі малюнкамі, але ЖЭС гэта не хвалявала. Раней Андрэя прыцягвалі да адміністрацыйнай адказнасці за нанясенне гэтага надпісу, але потым палічылі, што гэта ўсё ж такі злачынства.



Андрэй Леванюк

Як паведамляе брэсцкая "Вясна", 26 лютага ў Маскоўскім судзе Брэста Андрэя Левонюка прызналі вінаватым паводле арт. 23.34 КаАП за пікетаванне шляхам нанясення надпісу "Но избави нас от лукавого" на фасад жылога дома. Пастанову суда спрабавалі абскардзіць, яе адмянілі, але ў сувязі з

узбуджэннем крымінальнай справы па дадзеным эпізодзе. Следства расцаніла нанясенне радка з малітвы на сцяну будынка як злачынства па артыкуле 341 КК "апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці". Пракуратура пагадзілася з кваліфікацыяй дзеянняў.

У судзе дзяржаўнае абвінавачванне падтрымліваў старэйшы памочнік пракурора Брэста **Манько**.

Згодна з версіяй абвінавачвання, 13 лютага на фасадзе дома па вуліцы Вішнёвай Брэста чырвоным балончыкам была нанесеная надпіс "Но избави нас от лукавого". Гэтым быў нанесены ўрон ЖЭС-6 на суму **51 рубель 99 капеек.** Па матэрыялах справы, гэты надпіс пагаршыў "эстэтычнае ўспрыманне" будынка. Паводле абвінавачвання, такім чынам Леванюк праявіў незадаволенасць вынікамі выбараў прэзідэнта, а таксама дзеяннямі супрацоўнікаў праваахоўных органаў "па супрацьдзеянні масавым беспарадкам".

Цытата з Біблії — цынічная?



На судзе абвінавачаны Андрэй пагадзіўся, што надпіс наносіў ён. Але адзначыў, што нязгодны з паняццем "пашкоджанага маёмасці", бо маёмасць ўжо да гэтага неаднаразова была "пашкоджана" да яго — там ужо былі надпісы і іншыя малюнкі. Па словах мужчыны, у сувязі з гэтым ЖЭСу ўсё роўна трэба было перафарбаваць гэты будынак. Таксама Леванюк адзначыў, што на сайце "Онлайн Брэст" са спасылкай на Генпракуратуру яго справа апісвалася як "нанёс цынічны надпіс" – і мужчына выказаў здзіўленне, як радок з Біблії можа быць "цынічнай".

Як адзначаюць брэсцкія праваабаронцы, на сайце Генпракуратуры размешчаны артыкул, уключаючы загаловак, ідэнтычныя артыкулу на сайце "Онлайн Брэст". Дэталі справы супадаюць з дэталямі крымінальнай справы Леванюка. І там сапраўды выкарыстоўваецца фармулёўка "цынічныя надпісы".

Начальніца ЖЭСа: Трэба аднавіць эстэтычны выгляд сцяны будынка

У судзе выступілі тры сведкі: начальніца ЖЭС-6 г. Брэста **Таццяна Шыбун** і двое міліцыянтаў **Георгій Асінкін** і **Сяргей Вярэніч**. Начальніца ЖЭСа на судзе распавяла, што шкоду ацанілі зыходзячы з памеру ўчастка фасада будынка, на які быў нанесены надпіс. Каб цалкам аднавіць эстэтычны выгляд сцяны будынка, трэба зафарбоўваць усю сцяну. Той факт, што звычайна зафарбоўваюць прастакутнікамі або квадратамі, яна патлумачыла тым, што на поўную перафарбоўку не хапае бюджэтных сродкаў.

Двое іншых сведак былі з міліцыі. Асінкін у той дзень вяртаўся дадому пасля змены, ён і затрымаў Леванюка. Другі — участковы інспектар Вярэніч дастаўляў затрыманага Леванюка ў райаддзел.

Чым усё скончылася?



Суддзя Вера Філонік выносіць прысуд Андрэю Леванюку


У судовых спрэчках 6 красавіка пракурор Манько запрасіў для абвінавачанага Леванюка месяц арышту. Варта адзначыць, што ў межах адміністрацыйнай справы па арт. 23.34 КаАП Леванюк правёў у ІЧУ трое сутак: спачатку да суда, а потым суд менавіта прызначыў такое пакаранне. Суддзя Вера Філонік пагадзілася з дзяржабвінаваўцай і вынесла такое пакаранне па арт. 341 КК, якое ён прасіў для Андрэя Леванюка — 1 месяц арышту. Шкоду ў 51,99 рублёў Леванюк заплаціў яшчэ да суда. Прысуд Леванюк намераны абскарджваць.

Твитнуть





ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА




"Гэта бессэнсоўны акт прапаганды". Былы палітвязень ПК-17 пра сюжэт БТ пра яго калонію (фота)

"Кніга ў зняволенні – гэта больш чым кніга": што чытаюць беларусы ў СІЗА і калоніях?

У палітвязня ў турме здарыўся інфаркт і інсульт. Яго адправілі ў калонію

"А ў чым мне прызнаваць віну?" Гісторыя палітвязня з чырвонай біркай





ГАЛОЎНАЕ

"Гэта бессэнсоўны акт прапаганды". Былы палітвязень ПК-17 пра сюжэт БТ пра яго калонію фота



#ВолюВясне





ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Чэрвень 2023

Ліквідацыя апазіцыйных партый, папаўненне ў спісе "экстрэмісцкіх" матэрыялаў: хроніка пераследу 11 ліпеня (дапоўнена)

У Гомелі за абразу Лукашэнкі асудзілі былога іераманаха

Беларускія праваабаронцы ўзялі ўдзел у воркшопе "Смерць — гэта не правасуддзе"

Мінімум 36 асуджаных пасля затрымання на мяжы: вынікі адміністрацыйнага пераследу ў чэрвені

Адвакатку Юлію Юргілевіч і журналіста Паўла Мажэйку пачалі судзіць за перадачу інфармацыі "Белсату"

Затрыманні, папаўненні ў спісе "экстрэмісцкіх матэрыялаў", ціск на палітвязняў: хроніка пераследу 7-10 ліпеня (дапоўнена)

Жыхара Баранавіч асудзілі за абразлівы надпіс у пад'ездзе на адрас Лукашэнкі


МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2023



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC Memorial
Anti-Discrimination Centre

СЯБРОЎСТВА


ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh











E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY